# ФЕМІНІТЫВЫ Ў СЛОЎНІКУ Я. СТАНКЕВІЧА

**Багдановіч Крысціна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік — канд. філал. навук дацэнт Кулікović У. І.*

Разглядаюцца фемінітывы, шматлікія з іх знаходзяцца выключна ў слоўніку Я. Станквіча. Вызначаюцца суадносныя да іх значэннем назоўнікі мужчынскага роду. А таксама акрэсліваецца, якім чынам былі ўтвораны фемінітывы.

*Ключавыя словы: фемінітыў, слоўнік, асабовы назоўнік, словаўтварэнне, моўная карціна свету.*

# WORDS MEANING WOMEN IN J. STANKEVICH'S DICTIONARY

**Bogdanovich Kristina, Belarus**
*Belarusian State Technological University,*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor — senior lecturer Kulikovich V. I.*

The article deals the words meaning women, many of which are only in J. Stankevich's dictionary. The masculine nouns, the meaning of wichis correlated with the meaning of such words, are determined. In addition the word formation is identified.

*Keywords: words meaning women, dictionary, word meaning a person, word formation, language picture of the world.*

Уводзіны. Вялікалітоўска-расійскі слоўнік Я. Станкевіча змяшчае больш за 60 тысяч артыкулаў. Першае выданне было зроблена пасля смерці аўтара яго сынам Ю. Станкевічам у Нью-Ёрку ў 1990 г. [1]. Яно спалучае ў сабе рысы перакладнога і тлумачальнага слоўнікаў. Прынцып пабудовы слоўніка рэдкі для сучаснай лексікаграфічнай практыкі — гнездавы.

Фемінітывамі называюць словы жаночага роду, альтэрнатыўныя або парныя аналагічным паняццям мужчынскага роду, якія абазначаюць прафесію ці род заняткаў[2]. Увядзенне ў актыўны ўжытак фемінітываў пазіцыянуецца як эфектыўны спосаб надання ўвагі жанчынам і іх праблемам, узмацненне гендарнай адчувальнасці і змагання з гендарнай слепатой. Прыхільнікі выкарыстання фемінітываў лічаць, што існаваныя моўныя нормы спрыяюць дыскрымінацыі жанчын і завышаюць значнасць мужчын, тым часам як папулярызацыя фемінітываў дазваляе гендарную роўнасць аднавіць [3].

Задача артыкула — метадам суцэльнай выбаркі выявіць усе фемінітывы, змешчаныя ў слоўніку Я. Станкевіча на літару «А» і сістэматызаваць іх паводле тэматычнага прынцыпу дзеля стварэння поўнага слоўніка фемінітываў беларускай мовы.

Асноўная частка. Усяго на літару «А» ў слоўніку было выяўлена 176 назоўнікаў, якія абазначаюць асобу, з іх 42 фемінітывы. Сярод іх:

1. Назвы асоб па сацыяльным статусе і грамадскіх адносінах (5слоў): абароньніца – 'защитница'; абрака́ньніца – 'выборщица'; абранка – 'избранница'; адзоўніца – 'апелляторша'; адрабо́тніца—'работающая за долг'; алянда́рка – 'арендаторка, откупщица'; апяку́нка – 'опекунша'. Усе гэтыя фемінітывы ў слоўніку маюць суадносныя значэнне назоўнікі мужчынскага роду: абароньнік, абрака́ньнік, абра́нец, адзоўнік, адработнік, аляндáр, апяку́н.



Репозиторий БГТУ

2. Назвы асоб па рысах характару, паводзінах (11слоў): абры́дніца— ‘мерзавка’; агі́дніца—‘гадкая’; агні́ньніца – ‘бойкая, шустрая на что-либо’; агры́зьніца – ‘сварливая’; агу́каньніца—‘клеветница, поносительница’; адраджэнка – ‘возрождённая женщина’; апраме́тніца —‘резвая, ветренная’; апры́чніца — ‘любящая отдельно от других кушать, прихотливая’ апрычоніца – ‘любящая особенно от семьи лучшие кушанья, требующая особенного чего от общего стола’; ашука́лка і ашука́льніца – ‘обманщица’. Восем фемінітываў маюць суадносныя асабовыя назоўнікі мужчынскага роду: *абры́днік*, агі́днік, агры́зьнік, агу́каньнік, адраджэнец, апры́чнік, апрычонік, ашука́льнік. Да трох фемінітываў назоўнікі мужчынскага роду не пададзены: агні́ньніца, апраме́тніца, ашука́лка.

3. Назвы асоб па іх прафесійнай дзейнасці (9 слоў): *абараньніца* — ‘промышляющий печением или продажей сушек, баранок’; абіраньніца — ‘выборщица’; адвака́тка — ‘женщина адвокат’; акторка — ‘актриса’; анатомка — ‘женщина анатом’; апра́ўніца — ‘переплётчица’; аптакары́ха — ‘аптекарша, жена аптекаря’ аптакары́ца — ‘работница аптеки, изготовляющая лекарства, фармацевт; владелица аптеки’; арты́стая —‘артистка’; асыпа́льня — ‘женщина, обсыпающая вручную землёй при помощи *“гачкі”* молодые корнеплоды (картофель и проч.)’. Восем фемінітываў ў слоўніку маюць суадносныя значэннем назоўнікі мужчынскага роду: *абара́ньнік,* абіраньнік, адвака́т, актор, анатом,апра́ўнік, аптака́р,арты́сты. Адзін фемінітыў не мае суадноснага значэннем назоўніка мужчынскага роду: асыпа́льня. Прычына таму простая — такую працу выконвалі толькі жанчыны.

4. Назвы асоб па маёмаснаму стану, ладу жыцця (2 словы): абадранка — ‘оборванка’; абшарпанка — ‘оборванка’. Абодвафемінітывы маюць суадносныя значэннем назоўнікі мужчынскага роду: абадра́нец, абшарпанік.

5. Назвы асоб па разумовых здольнасцях, навыках (1 слова): адумыслоўка —‘специалистка’. Гэты фемінітыў мае суадносны значэннем назоўнік мужчынскага роду: адумысловец.

6. Назвы асоб, якія дзейнічаюць у спецыяльных сферах (культурнай, навуковай, рэлігійнай, антысацыяльнай і г. д.) (2 словы): адшчапе́нка — ‘отступница от веры; раскольница’; анархістая —‘анархистка’. Абодва фемінітывы маюць суадносныя значэннем назоўнікі мужчынскага роду: адшчапе́нец, анархі́сты.

7. Мнагазначныя словы, адно са значэнняў якіх уключае сему“фемінітыва” (6 слоў): але́йніца —‘1. маслобойня (постного масла). 2. хата, в которой бьют постное масло. 3. женщина, занимающаяся продажею или изготовлением конопляного и растительного вообще масла. 4. глиняный сосуд, в котором обыкновенно содержат конопляное масло. 5. простая глиняная лампа, налитая конопляным маслом’; абузьніца — ‘1. абузьнік 1.2. повеса, распутная женщина.’; ану́ча — ‘1. обмотка для ноги под сапог или лапоть, портянка, онуча2. тряпка вообще. 3. женщина дурного поведения или неопрятная’; апушчэніца — ‘1. неряшливая, ленивая. 2. распутная’; апушчэнка — ‘1. небрежная, ленивая. 2. развратная. 3. разведённая’; ашмётачка —‘1. тряпочка.2. женщина дурного поведения’. Пяць фемінітываў маюць суадносныя значэннем

Рэпазіторый БДПУ

назоўнікі мужчынскага роду: але́йнік, абузьнік, апушчэнік, апушчэнец, ашмётак. Да аднаго фемінітыва назоўнік мужчынскага роду не пададзены: ану́ча.

Спосаб утварэння ўсіх прааналізаваных фімінітываў са слоўніка Я. Станкевіча на літару А аднатыпны. Гэта суфіксацыя. Самымі прадуктыўнымі словаўтваральнымі элементамі выступаюцьсуфіксы -іц-, -ыц-, -к-, -лк-, -ых-. Утваральнай асновай, як правіла, з'уляецца аснова назоўніка мужчынскага роду, ад якой і выбудоўваецца фемінітыў: апякун — апякунка, агіднік — агідніца.

Заключэнне. Выяўленыя фемінітывы з лексікаграфічнага даведніка Я. Станкевіча засведчылі адну яскравую заканамернасць: беларуская мова багатая на назоўнікі, якія абазначаюць асоб жаночага полу незалежна ад роду заняткаў. Большасць з іх маюць адпаведнікі мужчынскага роду. Тыя, што адапведнікаў не маюць, указваюць, з аднаго боку, на спецыфіку працы, якая выконвалася пераважна жанчынамі, або можа быць патлумачана тэхнічнымі прычынамі пры падрыхтоўцы выдання.

Мы мяркуем, што сабраны матэрыял па ўсім слоўніку прынясе карысць для стварыння аб'ектыўнай моўнай карціны свету беларусаў, у якой вялікая роля належыць жанчыне.

Літаратура

1. Беларуская мова: Энцыкл. Беларус. Энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал.:Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.].— Мінск: БелЭн, 1994.— 655 с.

2. Паланова, А. У. Гендэрныя змены ў мове як вынік каштойнай трансфармацыі ў грамадстве / А. У. Паланова, Н. С. Дружыніна [Электроны рэсурс]. — Рыжым доступу: http://mvestnik.istu.irk.ru/journals/2015/04/articles/55?view=0. — Дата доступу: 10.10.2017.

3. Бубіч, В. Спосабы руху да гендарнай роўнасці ў сучасным медыадыскурсе Беларусі / В.Бубіч // матэрыялы 18-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 95-годдзю БДУ (10–11 лістапада 2016 г.).— Вып. 18. – Мінск: БДУ, 2016. – С. 491–494.

Рэпазіторый БДПУ